pospolitej / U. Paszkiewicz // Roczniki biblioteczne. 2004 (dr. 2005). R. 48. S. 107–127 : il.

7. **Paszkiewicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku : suplement 2 / Ursula Paszkiewicz. Poznań, 2006. 636 s. (Ministerstwo Kultury i Dziedzictwa Narodowego. Departament do Spraw Polskiego Dziedzictwa Kulturowego za Granicą. Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B. Wspólne Dziedzictwo).

8. **Paszkiewicz, U.** Książkowe znaki własnościowe bibliotek we Lwowie w XIX i XX wieku : stan i wybrane kierunki poszukiwań / U. Paszkiewicz // Kraków Lwów : książki-czasopisma-biblioteki XIX i XX wieku / pod red. Haliny Kosętki, Barbary Góry, Ewy Wójcik. Kraków, 2009. T. 9, cz. 1. S. 251–264.

9. **Paszkiewicz, U.** Inwentarze Biblioteki Ordynacji Zamojskiej przez ponad sześćdziesiąt lat uchodziły za spalone / U. Paszkiewicz // Cenne, bezcenne, utracone. 2011. № 1(66). S. 21–23 : il.

10. **Paszkiewicz, U.** Cathalogus cathalogorum : inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej od XVI wieku do 1939 roku : spis scalony, poprawiony i uzupełniony / U. Paszkiewicz // Warszawa : Ministerstwo Kultury i Dziedzictwa Narodowego, 2015. T. 1. 717 s. ; T. 2. 771 s.

11. **Paszkiewicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek do 1939 roku na ziemiach polskich (w obecnych granicach Rzeczypospolitej) (падрыхтавана да друку).

*Доўнар Л.І. (Мінск)*

## СЛЯДАМІ УРШУЛІ ПАШКЕВІЧ: ДА НОВЫХ АДКРЫЦЦЯЎ НА БІБЛІЯТЭЧНАЙ МАПЕ БЕЛАРУСІ

«Мапа пісьмовай культуры, – адзначае Уршуля Пашкевіч, – адкрываецца праз пошук між іншым слядоў бібліятэк, якія цягам стагоддзяў зазналі распыленне» [1]. Тут – у працяг – трэба сказаць, што гэта адкрыццё адбываецца дзякуючы такім рупліўцам, як сама даследчыца. Прадметам яе навукова-бібліяграфічных зацікаўленасцей сталі інвентарныя вопісы, каталогі, разнастайныя спісы зместу бібліятэк. Сабраны і выдадзены ў 1990–2006 гг. з удзелам Уршулі Пашкевіч бібліяграфічны корпус крыніцазнаўчых матэрыялаў [2], асабліва адносна бібліятэк на ўсходніх землях Рэчы Паспалітай, сам па сабе – цалкам – новая даследчая якасць, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таксама якасць колькасная, якая нясе шэраг перспектыў для вывучэння супольнай культурнай прасторы Польшчы, Літвы, Беларусі, Украіны, Латвіі, Расіі праз гісторыю бібліятэк і кнігазбораў.

Ролю і значэнне «здабытых з бяспамяцтва» крыніц у раскрыцці новага вобраза кніжнай культуры на ўсходніх землях Рэчы Паспалітай выразна акрэсліла Барбара Бяньkоўска: «Аказваецца, што не толькі вялікія гарады, але цэлыя ўсходнія тэрыторыі пакрывала густая сетка дынамічных бібліятэк, адрозных – справа ясная – па важнасці і па характары. Нават у мясцовасцях, якія з'яўляліся толькі пункцікамі на дакладнейшых мапах (альбо цалкам незазначаныя на іх), жылі, а часам толькі існавалі малыя, слабыя бібліятэчныя адзінкі, якія, аднак, канкурыравалі паміж сабой, а па ўсёй тэрыторыі вандравалі тысячы абменных камплектаў кніг. Абрысаваўся пейзаж кніжнай культуры нечпадзяванай інтэнсіўнасці, маляўнічасці і дынамікі, поўны ідэйных узлётаў і аднačасова супярэчнасцей, канфліктаў і горычы штодзённых бед. Далейшыя даследаванні, безумоўна, дапоўняць яго фактамі і высновамі, але падстава ўяўляецца прыгатаванай»[1] [3].

На сёння гэту падставу (аснову), за якой стаіць агромністая, не ў адзін дзясятак гадоў, карпатлівая навукова-бібліяграфічная праца польскіх даследчыкаў, асабліва Уршулі Пашкевіч, складаюць чатыры выданні (у 6 т.), прысвечаныя інвентарным вопісам і каталогам бібліятэк з усходніх зямель Рэчы Паспалітай, што ахопліваюць гістарычны перыяд існавання кнігазбораў з XVI ст. да 1939 г. [4]. Работа была высока ацэнена ў Польшчы, пра што сведчаць водгукі і рэцэнзіі, напрыклад, Казіміры Малячынскай, Эльжбеты Сладкоўскай, Ганны Алексіевіч, Яна Вося, Ганны Юзвін, Агнешкі Кокаль, Марыі Кальчыньскай і інш. У 2006 г. Уршуля Пашкевіч атрымала ўзнагароду «Przeglądu Wschodniego» ў катэгорыі «Выданне крыніц». Прадстаўленыя бібліяграфічныя крыніцы – гэта каштоўнейшы матэрыял па гісторыі бібліятэк Беларусі як у тэрытарыяльным ахопе беларускіх населеных пунктаў, так і ў значэнні сабраных першакрыніц – інвентарных вопісаў і каталогаў бібліятэк розных дзяржаўных і рэлігійных устаноў, арганізацый, прыватных кнігазбораў. Караль Гламбёўскі адзначаў: «Даўнія бібліятэчныя інвентары, якія даследуюцца не ў

---

[1] Тут і далей пераклад аўтара.

адзінкавых асобніках, але ў цэлай сваёй ацалелай масе, складаюць дасканалую крыніцу для пазнання духоўнага развіцця цэлых культурных асяродкаў у тых межах, з якіх паходзяць» [5].

Найбольшыя колькасныя паказчыкі па тэрытарыяльным ахопе населеных пунктаў Беларусі адлюстраваны ў двухтомным выданні Уршулі Пашкевіч «Інвентары і каталогі бібліятэк з усходніх зямель Рэчы Паспалітай да 1939 года» за 2000 [6] і 2006 гг. [7] – гэта 420 населеных пунктаў з 738 (у іх ліку мясцовасці Украіны – 216, Літвы – 81, Латвіі – 13, Расіі – 8) [8]. Пра бібліятэчныя зборы ў адзначаных мясцовасцях сведчаць звыш 2 тыс. крыніц. Усяго даследчыцай зафіксавана 2064 рукапісных і 87 друкаваных дакументаў, асноўныя з якіх датуюцца XVIII – пачаткам XX ст. [9]. Том другі, а дакладней дадатак 2 (suplement 2), змяшчае агульны для двух тамоў навукова-дапаможны апарат, а таксама характарыстыку сабраных матэрыялаў, пададзеную як у прадмове, так і ў выглядзе некалькіх графічных дыяграм [10].

Неабходна адзначыць, што кожнае наступнае пасля 1990 г. выданне з'яўляецца пэўным дапаўненнем папярэдняга, таму выкарыстанне іх у пошукавай працы даследчыка вымагае прагляду ўсіх тамоў. Выданні ў сваёй аснове звязаны агульнай методыкай: матэрыялы ў іх прыведзены ў алфавітным парадку па назве мясцовасці, дзе існавалі бібліятэкі (інстытуцыйныя, кляштарныя, прыватныя). Назвы бібліятэк або імёны іх уладальнікаў пададзены таксама ў алфавітным парадку ў межах дадзенага населенага пункта. У навукова-дапаможны апарат (індэксы) уключаны паказальнікі асабістых імёнаў, інстытуцыйных бібліятэк і кляштараў.

Агульныя колькасныя вынікі, вылучаючы па магчымасці Беларусь, мы паказалі ў наступнай табліцы (адначасова трэба ўлічваць, што фактаграфічныя даныя адносна гістарычных беларускіх населеных пунктаў і кнігазбораў могуць быць пры гэтым удакладнены адпаведна гісторыка-культурным межам Беларусі ў часы Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай Імперыі і II Рэчы Паспалітай).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца*

| Крыніца | Храналогія выяўленых дакументаў | Колькасць улічаных дакументаў | | Колькасць ахопленых населеных пунктаў | | Размеркаванне дакументаў па асноўных тыпах бібліятэк | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | рукапісныя | друкаваныя | усяго | Беларусь | установа, арганізацыі | рэлігійныя установы | прыватныя кнігазборы |
| Bibliografia, 1990. Cz.1–2 | XVI ст. – 1939 г. | | 2 562 | 400* | 60** | разам з прыватнымі – 260 | 1 702 | |
| Rękopiśmienne inwentarze, 1996 | 1553–1939 | 415 | | 107*** | 28 | 107 | 139 | 169 |
| Inwentarze i katalogi, 1998 | 1510–1939 | 680 | 352 | 234**** | 55 | 440 | 265 | 326 |
| Inwentarze i katalogi, 2000–2006. Supl. 1–2 | XVI ст. – 1939 г. | 2 064 | 87 | 738***** | 420 | 1369 | 596 | 186 |

*Заўвага.* 400* – мясцовасці на тэрыторыі Польшчы і Рэчы Паспалітай, 60** – мясцовасці на ўсходніх тэрыторыях Рэчы Паспалітай; з 107***, у тым ліку мясцовасці Украіны – 73, Літвы – 6; з 234****, у тым ліку мясцовасці Украіны – 128, Літвы – 49, Расіі – 2; з 738*****, у тым ліку мясцовасці Украіны – 216, Літвы – 81, Латвіі – 13, Расіі – 8.

Уражвае як колькасны аб'ём першакрыніц – інвентарных вопісаў і каталогаў бібліятэк, так і корпус дакументаў па іх выяўленні ў шматлікіх фондасховішчах розных краін, шырыня крыніцазнаўчай інфармацыі. Напрыклад, у даведніку «Бібліятэкі на ўсходніх землях ІІ Рэчы Паспалітай» (1998) бібліяграфічны спіс выкарыстаных апублікаваных крыніц складае 828 пазіцый, не ўлічваючы матэрыялы з 20 архіваў [11]. Сярод асноўных вылучаюцца такія групы крыніц інфармацыі, як даведачныя, бібліяграфічныя, афіцыйныя, статыстычныя, бібліялагічныя і навуказнаўчыя, рэгіянальныя і лакальныя манаграфіі, справаздачы аб дзейнасці арганізацый, успаміны, публікацыі ў прэсе (асабліва спецыяльнай), уладальніцкія пазнакі, архіўныя дакументы, якія ў комплексе і паадзінкава раскрываюць невядомую гісторыю бытавання кнігі і кнігазбораў, у тым ліку і ў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У «Bibliografii» да даведніка звяртае на сябе ўвагу інфармацыя аб публікацыях з шэрагу польскіх перыядычных выданняў 1920–30-х гг., да прыкладу пра бібліятэкі ў Ваўкавыску, Гродне, Лідзе, Навагрудку, Нясвіжы, Паставах, Пінску, Слоніме, Стоўбцах і інш. [12]. Нельга не ўзгадаць, і пра крыніцы аб змесце бібліятэчных фондаў, якія былі адшуканы Уршуляй Пашкевіч у сямейных архіўных актах Радзівілаў (AGAD) [13]; актах касцельных візітацый кляштараў кармелітаў босых у Гродне (БАН Літвы) [14], піяраў у Полацку (БУВіл) [15] і інш.

Даследчыцы не бракуе і крытычнага падыходу да сваёй працы, які яна адлюстроўвае ў артыкуле «Выбраныя праблемы дакументавання бібліятэчных збораў на ўсходніх землях Рэчы Паспалітай да 1939 года», змешчаным у «Rocznikach Bibliotecznych» [16]. У публікацыі даецца характарыстыка сабранага матэрыялу паводле тэрытарыяльнага і храналагічнага ахопу, класіфікацыі бібліятэк; разглядаюцца методыка апісання крыніцазнаўчых матэрыялаў, перспектывы далейшых прац. Уршуля Пашкевіч адзначае: «Комплексная праграма рэгістравання інвентароў і каталогаў бібліятэк апрача часу і сродкаў вымагае супрацоўніцтва асяродкаў, а прынамсі паадзінкавых асоб з краю і заграніцы» [17]. Не пакідае яе спадзяванне, што ад дэкларавання тымі ці іншымі асобамі супрацы, словы ўсё ж стануць канкрэтнымі справамі.

Мы ж са свайго боку вельмі ўдзячныя Уршулі Пашкевіч і яе калегам за выкананую работу, якая служыць беларускім спецыялістам узорам і асновай для стварэння айчынных бібліяграфічных даведнікаў, пра што адзначалася ў адной з нашых нядаўніх публікацый [18]. А як адзін з прэцэдэнтаў для супрацоўніцтва – выкананая ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў студэнткай Марыянай Іванчыкавай у 2013–2014 гг. дыпломная работа на тэму «Бібліятэкі Беларусі (XVI ст. – 1939 г.) у выданнях польскай даследчыцы Уршулі Пашкевіч: каталог» (навуковы кіраўнік Л.І. Доўнар), у якой таксама пацверджана, што інвентарныя вопісы і каталогі кнігазбораў як каштоўнейшыя дакументы па гісторыі кніжнай культуры Беларусі вартыя вылучэння ў якасці асобнага прадмета навуковых даследаванняў, могуць складаць самастойны аб'ект бібліяграфавання ва ўсёй сваёй масе, патрабуюць узнаўлення ў друкаванай ці электроннай форме як дакументальныя крыніцы інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры далейшым працягу падобнай працы і/ці адаптацыі фундаментальных даведнікаў Уршулі Пашкевіч для Беларусі неабходна выкарыстанне комплекснага падыходу да крыніцазнаўчых матэрыялаў, а таму і папаўненне пэўных прагалаў [19], што цалкам паспрыяе з'яўленню новых пунктаў і адпаведна абнаўленню шляхоў на бібліятэчнай і кніжнай мапе Беларусі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Paszkiewicz, U.** Wybrane problemy dokumentacji zbiorów bibliotecznych na wschodnich ziemiach Rzeczypospolitej do 1939 roku / Urszula Paszkiewicz // Roczniki Biblioteczne. Warszawa, 2001. T. 45. S. 55.

2. **Paszkiewicz, U.** Bibliografia inwentarzy i katalogów księgozbiorów polskich i założonych w Polsce do 1939 roku / Urszula Paszkiewicz. Warszawa : Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego, 1990. Cz. 1 : Księgozbiory instytucjonalne w układzie topograficznym. 286 s. ; Cz. 2 : Księgozbiory prywatne w układzie abecadłowym nazwisk właścicieli. 204 s. ; **Paszkiewicz, U.** Rękopiśmienne inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej. Spis za lata 1553–1939 / Urszula Paszkiewicz. Warszawa : Wydawnictwa DiG, 1996. 96 s. (Polskie dziedzictwo kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo) ; **Biblioteki** na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej : informator / red. nauk. Barbara Bieńkowska ; oprac.: Urszula Paszkiewicz [i in.]. Poznań : Bogucki, 1998. 800 s. (Polskie dziedzictwo kulturalne. Seria B : Wspolne dziedzictwo) ; **Paszkiewicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej (spis za lata 1510–1939) / Urszula Paszkiewicz. Warszawa : Wydawnictwo DiG, 1998. 260 s. (Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo) ; **Paszkiewicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 1 / Urszula Paszkiewicz. Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2000. 301 s. (Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo) ; **Paszkiewicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 2 / Urszula Paszkiewicz. Poznzń : Bogucki ; Wydawnictwo Naukowe, 2006. 636 s. (Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo).

3. **Biblioteki** na wschodnich ziemiach … S. 20–21.

4. **Paszkiewicz, U.** Bibliografia inwentarzy … ; **Paszkiewicz, U.** Rękopiśmienne inwentarze … ; **Biblioteki** na wschodnich ziemiach ... ; **Paszkiewicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej (spis za lata 1510–1939) ... ; **Paszkiewicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 1… ; **Paszkie-**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**wicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 2 …

5. **Migoń, K.** Dawne katalogi biblioteczne jako źródło wiedzy o kulturze książki / Krzysztof Migoń // Roczniki Biblioteczne. Warszawa, 2005. T. 49. S. 302.

6. **Paszkiewicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 1 …

7. **Paszkiewicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 2 …

8. **Paszkiewicz, U.** Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 2 … S. 9, 636.

9. **Там жа.** S. 635.

10. **Там жа.** S. 635–636.

11. **Biblioteki** na wschodnich ziemiach ... S. 9.

12. Там жа. S. 27–74.

13. **Paszkiewicz, U.** Wybrane problemy dokumentacji … S. 62.

14. Там жа. S. 75.

15. Там жа. S. 76.

16. Там жа. S. 55–90.

17. Там жа. S. 89.

18. **Доўнар, Л.І.** Чытаючы бібліяграфічныя крыніцы па гісторыі кніжных сувязяў і кнігазбораў Беларусі XVIII – пачатку XX ст. / Л. І. Доўнар // Материалы Международного конгресса «Национальная библиотека как феномен культуры», приуроченного к 90-летию Национальной библиотеки Беларуси (Минск, 5–7 сентября 2012 г.) [Электронный ресурс] / Нац. б-ка Беларуси ; сост. А. А. Суша. Электрон. текстовые, граф. дан. и прогр. (19,5 Мб). Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2012. 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). (VIII Международные книговедческие чтения «Исторические книжные коллекции во времени и пространстве»).

19. **Лабынцев, Ю. А.** Фундаментальные архивно-библиографические указатели доктора Уршули Пашкевич о полутысячелетней истории восточноевропейской книжной культуры / Ю. А. Лабынцев // Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития : материалы II Междунар. науч. семинара (Москва, 24–25 ноября 2014 г.). Москва : ФГБУ науки Научный и издательский центр «Наука» РАН ; Минск : Центральная научная библиотека НАН Беларуси, 2014. С. 159.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Рассматриваются работы польской исследовательницы Уршули Пашкевич, предмету ее научно-библиографических интере-*

сов, которым стали инвентарные описи, каталоги, разнообразные списки содержания библиотек. Анализируется собранный и изданный в 1990–2006 годах с участием Уршули Пашкевич библиографический корпус источниковедческих материалов, связанный с историей библиотек на восточных землях Речи Посполитой, особенно на территории Беларуси. Отмечается роль и значение «добытых из беспамятства» источников в раскрытии нового образа книжной культуры на восточных землях Речи Посполитой, подчеркивается новое исследовательское качество, а также качество количественное, несущее ряд перспектив для изучения совместного культурного пространства Польши, Литвы, Беларуси, Украины, Латвии, России через историю библиотек и книжных собраний.

The article examines the works of the Polish researcher Ursula Pashkevich and the subject of her scientific and bibliographic interests – inventories, catalogs, various lists of libraries' content. The author analyzes the bibliographic body of source study materials collected and published in 1990–2006 with the participation of Ursula Pashkevich and dealing with the history of libraries in the eastern lands of the Polish-Lithuanian Commonwealth, particularly in the territory of Belarus. The author points out the role and significance of the sources «extracted from oblivion» in the disclosure of a new image of book culture in the eastern lands of the Polish-Lithuanian Commonwealth, emphasizes the new research quality as well as the quantitative quality, which opens up a number of prospects for the study of the joint cultural space of Poland, Lithuania, Belarus, Ukraine, Latvia and Russia through the history of libraries and book collections.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ